УДК 342.536

***Л. А. Рабцава***
*Магілёўскі інстытут МУС Рэспублікі Беларусь*

# ДА ПЫТАННЯ АБ НЕСУПАДЗЕННІ КОЛЬКАСНАГА СКЛАДУ ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь, згодна з артыкулам 90 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца Парламент – Нацыянальны сход, таму першараднае значэнне набывае правільная і дакладная арганізацыя яго дзейнасці.

Пытанні арганізацыі работы як самога Нацыянальнага сходу, так і кожнай з яго палат разглядаюцца ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24.11.1996 г., 17.10.2004 г.) і канкрэтызуюцца ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 года № 370-З "Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь", Пастанове Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 19 снежня 2008 года № 57 СР4/I "Аб Рэгламенце Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь", Пастанове Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2015 года № 707-П5/VIII "Аб Рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь".

Ніжняя палата Парламента – Палата прадстаўнікоў – выконвае значны аб'ём работы, разглядаючы і прымаючы законы, якія рэгулююць найбольш важныя напрамкі грамадскіх адносін, аднак без узгаднення з верхняй палатай – Саветам Рэспублікі – нарматыўныя прававыя акты не набываюць юрыдычнай сілы.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, з'яўляючыся палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, мае замацаваны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь наступны парадак фарміравання. Па восем членаў Савета Рэспублікі ад кожнай вобласці і горада Мінска выбіраюцца тайным галасаваннем на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з заканадаўствам у склад верхняй палаты Нацыянальнага сходу павінна ўваходзіць 64 члены.

Аднак на 19 кастрычніка 2012 года – адкрыццё першай сесіі Савета Рэспублікі V склікання – у склад Савета Рэспублікі ўвайшлі 58 чалавек, двое з якіх былі прызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Адпаведная інфармацыя адлюстравана ў "Матэрыялах па выніках першай сесіі Савета

Рэспублікі Нацынальнага сходу Рэспублікі Беларусь V скліканння (19 кастрычніка – 20 снежня 2012 г.)".

Інфармацыя ад 24 красавіка 2016 года, змешчаная на афіцыйным сайце Савета Рэспублікі http://www.sovrep.gov.by, таксама дазваляе зрабіць вывад аб недастатковай укамплектаванасці вышэйшай палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: назіраецца адсутнасць аднаго члена Савета Рэспублікі ад Магілёўскай вобласці, па адным – ад Гродзенскай вобласці і горада Мінска, трох сенатараў – ад Віцебскай вобласці. Сярод васьмі членаў Савета Рэспублікі, назначаных Прэзідэнтам, адсутнічае адзін парламентарый.

Дапушчальнай прычынай няпоўнага складу Савета Рэспублікі можна палічыць датэрміновае спыненне паўнамоцтваў членаў палаты.

Артыкул 8 Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 1998 г. № 196-З "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" змяшчае шэраг палажэнняў, згодна з якімі паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі могуць быць спынены датэрмінова:

1. У сувязі з выбраннем або назначэннем члена Савета Рэспублікі на пасаду, займанне якой, згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь", з'яўляецца несумяшчальным з выкананнем паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі (п. 1 ч. 1 арт. 8).

Прыкладам правапрымянення адзначанай нормы з'яўляецца той факт, што 27 снежня 2014 года члены Савета Рэспублікі ад Віцебскай вобласці Аляксандр Касінец і Наталля Качанава занялі пасады Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і намесніка Прэм'ер-міністра адпаведна.

Былы член Савета Рэспублікі Валерый Іваноў, які выступаў прадстаўніком ад Магілёўскай вобласці, заступіў на пасаду Старшыні Праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.

2. На падставе пісьмовай заявы члена Савета Рэспублікі аб складанні паўнамоцтваў па стане здароўя або з прычыны іншых абставін, якія перашкаджаюць іх выканню.

З гэтай прычыны да заканчэння чатырохгадовага тэрміну работы Парламента выйшаў у адстаўку Анатолій Рубінаў – сенатар, які прадстаўляў горад Мінск.

3. У выпадку прызнання яго судом недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным.

4. У выпадку прызнання выбараў несапраўднымі.

5. У сувязі з абвінаваўчым прыгаворам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у законную сілу ў адносінах да асобы, якая з'яўляецца членам Савета Рэспублікі.

6. У выніку спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

7. У выніку адклікання члена Савета Рэспублікі.

8. У сувязі з пісьмовай заявай члена Савета Рэспублікі аб складанні паўнамоцтваў па асабістых прычынах.

9. У выпадку непадпісання абавязацельстваў аб непрыманні без згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўных узнагарод замежных дзяржаў.

10. У выпадку невыканання абмежаванняў, прадугледжаных ч. 7 і 8 арт. 6 Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 1998 г. № 196-З "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" (члены Савета Рэспублікі не маюць права прымаць маёмасць (падарункі) ці атрымліваць іншую выгоду ў выглядзе паслуг у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў, выкарыстоўваць у пазаслужбовых мэтах сродкі матэрыяльна-тэхнічнага, фінансавага і інфармацыйнага забеспячэння, другую маёмасць адпаведнага дзяржаўнага органа ці службовую тайну).

Паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі, які ажыццяўляе іх на прафесійнай аснове, таксама могуць быць спынены датэрмінова па рашэнні палат у выпадку:

1) непрадстаўлення дэкларацыі аб даходах і маёмасці ці наўмыснага ўнясення ў яе няпоўных, няпэўных звестак;

2) невыканання абмежаванняў, прадугледжаных ч. 4–6 арт. 6 Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 1998 г. № 196-З "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" (члены Савета Рэспублікі не маюць права займацца ў рабочы час іншай працай (дзейнасцю), якая аплочваецца, акрамя выкладчыцкай, навуковай, культурнай, творчай дзейнасці, медыцынскай практыкі, выконваць работу на ўмовах сумяшчальніцтва, акрамя работы ў дзяржаўных арганізацыях, у парадку і на ўмовах, устаноўленых заканадаўствам аб працы, займаць іншыя дзяржаўныя пасады, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі).

Адной з прычын спынення паўнамоцтваў члена Савета Рэспублікі з'яўляецца яго смерць. Такі лёс заўчасна напаткаў прадстаўніка ад Віцебскай вобласці, парламентарыя Аляксандра Саладкова.

Член Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці часова спыніў сваю дзейнасць да высвятлення прычын учынку, які дыскрэдытуе яго як парламентарыя і можа паслужыць, згодна з арт. 143 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 11 лютага 2000 года № 370-З, падставай для адклікання.

Што датычыцца парламентарыяў, якіх назначае ў Савет Рэспублікі Прэзідэнт, то ні адзін з нарматыўных прававых актаў не рэгламентуе тэрмін прызначэння членаў Савета Рэспублікі Кіраўніком краіны.

Пункт 30 арт. 17 Закона Рэспублікі Беларусь ад 21 лютага 1995 года № 3602-XII "Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь" сярод аб'ёмнага пераліку паўнамоцтваў Кіраўніка дзяржавы замацоўвае наступную фармулёўку аднаго з іх – ажыццяўленне іншых паўнамоцтваў, калі гэта не супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На падставе зместу гэтага палажэння можна меркаваць,

што Прэзідэнт мае права самастойна вызначаць не толькі якасны, але і колькасны склад прадстаўнікоў (да 8 чалавек), назначаных ім у Савет Рэспублікі.

З улікам усяго адзначанага мэтазгодна зрабіць выснову, што колькасная неадпаведнасць членаў Савета Рэспублікі заканадаўча замацаванай норме ў складзе вышэйшай палаты Нацыянальнага сходу (на пачатак адкрыцця першай сесіі Савета Рэспублікі V склікання – 58 членаў замест 64; па стане на пачатак першага пасяджэння адзінаццатай сесіі Vсклікання (з 4 красавіка 2016 года) – 57 замест 64) не з'яўляецца прынцыповай з прычыны таго, што пасяджэнне Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, згодна з ч. 4 арт. 103 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, лічыцца правамоцным пры ўмове прысутнасці на ім не менш за 2/3 членаў палаты ад поўнага яе складу, і ў сувязі з гэтым з'яўляецца абумоўленай і падмацаванай нарматыўнай прававой базай нацыянальнага заканадаўства.

УДК 347.2/3

***Д. А. Свиридов***
*Могилевский институт МВД Республики Беларусь*

# ДОГОВОР ФРАНЧАЙЗИНГА КАК ЭФФЕКТИВНЫЙ МЕТОД УПРАВЛЕНИЯ ОБЪЕКТАМИ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Проведение ряда рыночных реформ в Республике Беларусь повлекло за собой значительные нововведения в хозяйственные отношения между участниками предпринимательской деятельности и обусловило появление широкого спектра отношений, производственного и гражданско-правового плана, которые в предыдущие годы практически отсутствовали. На текущем этапе развития общества Республики Беларусь объекты интеллектуальной собственности являются важнейшим активом предпринимательской деятельности, который гарантирует устойчивое развитие субъектов предпринимательства как на внутреннем рынке, так и на внешнем.

Такие объекты могут быть внесены в уставной фонд создаваемого либо уже действующего хозяйственного общества или же образовываться самим субъектом предпринимательства для применения в повседневной деятельности, или же быть взносом в совместную деятельность нескольких субъектов предпринимательской деятельности.

На данный момент в отечественной юридической практике особую актуальность приобретает вопрос в первую очередь не о том, как правовыми сред-